элементов и мотивов, относящихся к разным историческим эпохам.

УДК 741+378.147.025.7

## Мастак-педагог як суб’ект адукацыйнай дзейнасці

Барбарчык М.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Нягледзячы на дадзеную чалавеку ад прыроды здольнасць да творчай дзейнасці, толькі мэтанакіраванае, правільна арганізаванае навучанне дае магчымасць забяспечыць высокі ўзровень развіцця закладзеных здольнасцей. Існае значэнне ў адукацыйным працэсе разам з іншымі маюць дысцыпліны, звязаныя з выяўленчым мастацтвам, бо змяшчаюць эфектыўныя сродкі выхавання і развіцця. У сувязі з гэтым неабходна, абапіраючыся на вядомы вопыт у дыдактыцы, разгарнуць якасны вучэбны працэс, павысіўшы эфектыўнасць педагагічнага ўплыву на вучняў, якія прыйшлі ў вучэбную установу атрымаць веды і прафесію, пераймаючы вопыт выкладчыкаў. Пагэтаму адукаваны і вопытны педагог – адна з асноўных частак ланцуга вучэбна-педагагічных узаемадзеянняў.

У сувязі з гэтым трэба акрэсліць вядучую ролю педагога ў вучэбным працэсе, а залогам поспеху яго дзейнасці з’яўляецца наступнае:

- валоданне высокім узроўнем адукаванасці і прафесійнай культуры выкладчыка і мастака, пераканаўчасцю і гуманізмам;
- уменне падабраць значымы і адпаведны прадмету вучэбны матэрыял;
- уменне, згодна форм, метадаў, мэт і задач, стварыць эфектыўнае праграмнае забеспячэнне;
- здольнасць эфектыўна ўжываць прыёмы і метады навучання, выкарыстоўваючы інавацыйныя педагагічныя тэхналогіі;
- уменне правільна арганізаваць вучэбны працэс як структурна, так і псіхалагічна;
- уменне аб’ектыўна, абгрунтавана рабіць дыферынцаваную ацэнку вучэбных работ.

Важным для настаўніка з’яўляецца здольнасць прывабіць складанасцю і дынамізмам заданняў, стварыць пазітыўны эмацыянальны настрой, павысіць матывацыю, фарміраваць погляды і ідэалы вучняў. Педагагічная практыка паказвае, што больш складаныя заданні выклікаюць у вучняў цікавасць, інтарэс, большую стараннасць пры выкананні работы. Адна з асноўных задач навучання мастацтву – выхаваць у будучых творцаў патрэбу ў самастойнай рабоце, што несумненна ў ходзе самападрыхтоўкі паглыбіць і пашырыць веды. Дазволіць вучню самастойна фарміраваць у сабе ўменне вучыцца, а ў далейшым эфектыўна выкарыстоўваць назапашаныя веды і навыкі ў сваёй прафесійнай дзейнасці.